**ДЗЕВАШЫ́ЧЫ**, археалагічныя помнікі — селішча і курганны могільнік каля в. Дзевашычы Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл.

Селішча за 0,1 км на ПдУ ад вёскі, на правым беразе р. Аслік. Пл. каля 1,5 га. Адкрыў і абследаваў у 1975 Я.Р.Рыер. Культ. пласт 0,1 м. На паверхні і ў гумусе знойдзены рэшткі зробленай на ганчарным крузе керамікі 10—17 ст.

Курганны могільнік за 0,1 км на У ад селішча. Вядомы з 1924. 34 насыпы выш. 0,5—3,5 м, дыям. 3—12 м. У 1975 Я.Р.Рыер даследаваў 1 курган. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў насыпе, галавой на З. Знойдзены фр-т зробленага на ганчарным крузе венчыка гаршка к. 10—11 ст.

*Я.Р.Рыер.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова